■ Невядомыя старонкі гісторыі

# НА МАНЕЎРЫ — У ЛАГЕР-КАЗКУ

## Унікальная кніга аб вытоках беларускай арміі — «Палігон. Гісторыя Скобелеўскага ваеннага лагера» — пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда»

**Калі запытацца ў многіх з нас, што такое Скобелеўскі лагер, наўрад ці выявіцца вялікая колькасць знаўцаў. І толькі бывалыя вайскоўцы скажуць пра Абуз-Лясноўскі палігон, дзе сёння ўдасканальвае баявое майстэрства беларуская армія. А між іншым за 125 гадоў існавання прызначэнне гэтага месца — як бы яно ні называлася — не змянілася.**

Пачынаючы з канца XIX стагоддзя невялікае поле паміж Слонімам і Баранавічамі становіцца эпіцэнтрам баявой падрыхтоўкі. На манеўры ў Скобелеўскі лагер, названы ў гонар «белага генерала», прыбываюць вайскоўцы Рускай імператарскай арміі. У асноўным — ураджэнцы Беларусі.

Летні лагер Мінскага гарнізона, пабудаваны ў 1892 годзе, ніколі не закрываўся. З моманту яго ўтварэння ён належыў войскам царскай арміі. У гады Першай сусветнай тут размяшчаліся палігон і лагер для немцаў. У міжваенны перыяд, калі тэрыторыя знаходзілася пад Польшчай, — гэта польскі вайсковы палігон, які падчас Другой сусветнай вайны ператварыўся ў канцэнтрацыйна-працоўны лагер для савецкіх грамадзян. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тут — палігон агульнасаюзнага значэння. Цяпер ён належыць нашай арміі.

— Скобелеўскі лагер уяўляў сабой рускі купецкі гарадок, — расказвае **вядомы калекцыянер, лаўрэат прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ.** — Нягледзячы на сваё ваеннае прызначэнне, ён вылучаўся нестандартнай, нават дзіўнай архітэктурай — нагадваў казачны піянерскі лагер.

Пераканацца ў гэтым можна, пагартаўшы кнігу «Палігон. Гісторыя Скобелеўскага ваеннага лагера», якая пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі ўжо выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда». Аўтарскі калектыў — калекцыянеры Уладзімір Ліхадзедаў і Уладзімір Пяфціеў, а таксама доктар царкоўнай гісторыі Гардзей Шчаглоў — прадставілі філакартычнае даследаванне, тэма якога дагэтуль не ўздымалася.






Фотаздымкі, змешчаныя ў кнізе, не дадуць схлусіць. У дарэвалюцыйны час Скобелеўскі лагер уяўляў сабой не проста палігон для манеўраў і вучэнняў, гэта быў жылы лагер са складанай інфраструктурай. Акрамя відаў самога палігона, на фотаздымках — шыкоўныя будынкі афіцэрскіх сходаў, манеўры, стрэльбы. Тут можна ўбачыць не толькі баявую падрыхтоўку войскаў Рускай арміі, а і тое, як узнагароджвалі найлепшых вайскоўцаў, як быў наладжаны іх побыт, якім чынам афіцэры і салдаты бавілі вольны час. Адным словам, гэта не было замкнёнае жыццё ваеннага гарнізона — тут знаходзіліся цэлыя вуліцы, вельмі прыгожыя асабнякі афіцэрскіх сходаў, стаяла царква, у якой у тым ліку маліліся жыхары навакольных вёсак.

З архіўных даных вядома, што пазней на тэрыторыі лагера была пабудавана яшчэ адна царква — ранейшая, відаць, не ўмяшчала такой колькасці вернікаў. Але фотаздымкаў, якія пацвярджаюць гэты факт, не захавалася. Даследчыкі мяркуюць, што перад акупацыяй мясцовасці немцамі ў Першую сусветную вайну прыхаджане царкву разабралі.

Фотаздымкі дапоўнены тэкставай інфармацыяй на рускай і англійскай мовах. Цікавыя звесткі ўзяты не толькі з архіваў, а і з тагачасных газет, у асноўным беларускіх, якія захоўваюцца ў калекцыі Уладзіміра Пяфціева. Напрыклад, у адной з газет змешчана скарга на баранавіцкага ўрача, які першым у горадзе набыў уласны аўтамабіль, чым, вядома, вельмі ганарыўся. Але была ў яго і іншая загана — ліхачыў добра, у тым ліку і па вуліцах Скобелеўскага лагера. І ніяк на яго не маглі знайсці ўправы, пакуль аднойчы аўтамабіліст не напалохаў жонку і дачку знатнага генерала. Пасля гэтага выпадку стаў сачыць за хуткасцю.

Скобелеўскім лагер называўся не выпадкова. Быў час, калі Мінскім гарнізонам, на балансе якога і знаходзіўся лагер, камандаваў генерал Міхаіл Скобелеў. Выдатны рускі военачальнік XIX стагоддзя праславіўся падчас Руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў. За любоў да белых кіцеляў і коней увайшоў у гісторыю як «белы генерал».

**Напрыклад, у адной з газет змешчана скарга на баранавіцкага ўрача, які першым у горадзе набыў уласны аўтамабіль, чым, вядома, вельмі ганарыўся.**

Кніга, прысвечаная гісторыі Скобелеўскага лагера, не першы праект аўтарскага калектыву. Уладзімір Ліхадзедаў, Уладзімір Пяфціеў і Гардзей Шчаглоў у такім жа фармаце ўжо паспелі расказаць пра падзеі 1812 года, пра лёс князя Уладзіміра.

— Ужо другое дзесяцігоддзе адлічвае праект «У пошуках страчанага», які вырас на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня», — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Вялізны ілюстрацыйны масіў з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава ператварыўся ўжо ў некалькі філакартычных кніг, звязаных з гісторыяй Першай сусветнай вайны.

Тым не менш Уладзіміру Ліхадзедаву яшчэ ёсць пра што расказаць. Цяпер ён працуе над тэмай, звязанай з помнікамі, якія ў розныя часы былі пастаўлены ў Беларусі. Пра што канкрэтна даведаецца зацікаўлены чытач — пакуль інтрыга.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН і з калекцыі Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА**

■ Мінскія хронікі

# ГІГАНЦКІ ПАРК І «КЛЮБЫ» ПА ІНТАРЭСАХ

## Воблік сталіцы ў міжваенны перыяд

**У 1920—1930-я гады Мінск перажываў сур'ёзныя змены. Губернскі горад станавіўся адміністрацыйным цэнтрам маладой рэспублікі. Якраз тады пачалі думаць аб рэканструкцыі горада, узводзіць будынкі ў нязвыклым канструктывісцкім стылі, па-новаму арганізоўваць вольны час...**

### Захаваць нельга зносіць

— У сувязі з павелічэннем насельніцтва Мінска ў гэты перыяд у горадзе паўстаў шэраг праблем. Па-першае, банальна не хапала будынкаў. У асноўным забудова была нізкапавярховай і шматлікія новыя ўстановы і арганізацыі не было дзе размясціць. Па-другое, пачаліся цяжкасці з транспартам, — расказаў **краязнаўца Павел РАСТОЎЦАЎ.**

Першыя намёткі генплана Мінска былі зроблены ў 1926 годзе, праўда, потым уся работа была разбіта ў пух і прах. Бо ў спецыялістаў адсутнічала геаздымка горада і не было абгрунтаванняў для тэкставай часткі.

У гэты ж перыяд пачалася глабальная рэканструкцыя Масквы: шырокія вуліцы, «парадныя дамы» і нават перанос будынкаў. Прадумаў план архітэктар Кагановіч, аўтарытэт якога ў той час быў настолькі высокі, што ў праектных дакументах па ўсім Саюзе пасля цытат Леніна і Сталіна абавязкова ішлі яго выказванні. Падобныя з маскоўскімі працэсы распаўсюдзіліся на сталіцы ўсіх савецкіх рэспублік.

Паколькі ў Мінску не было добрай праектнай школы, ужо ў 1930-я гады працаваць над новым планам прыехалі прадстаўнікі Ленгенпрагара. Наталля Макляцова, якая потым засталася ў беларускай сталіцы, спачатку адзначала, што трапіла ў досыць правінцыйны горад, у якім было ўсяго некалькі цікавых будынкаў.

Работа архітэктараў пад кіраўніцтвам прафесара Вітмана ў 1931 годзе таксама прайшла марна. Таму што ўсё яшчэ не было тапаграфічнай здымкі, геалагічнай прапрацоўкі мясцовасці, ніхто нічога не ведаў пра глебы горада і раянаванне. Працаваць над геадэзічнай здымкай пачалі толькі ў 1934 годзе, праўда, зроблена яна была якасна. На картах былі бачныя ўсе даваенныя дамы ў маштабе 1: 2000, гэта значыць у адным сантыметры — 200 метраў, што тады лічылася вельмі падрабязнай схемай.

У 1935 годзе Мінгарсавету было прапанавана сур'ёзна разгледзець пытанне раяніравання месцаў для жылля, прамысловасці і культурна-паркавых зон. Сярод галоўных праблем фігуравалі затапленне тэрыторый каля Свіслачы і чыгунка, якая псавала аблічча горада. Узвядзенне кожнага новага будынка ўспрымалася праз прызму: а ці зможам мы гэта зрабіць? Не хапала матэрыялаў, часцяком тое ж дахавае жалеза здымалі са старых пабудоў.

У новым плане, які ствараўся на аснове геаздымкі, велізарны раздзел быў прысвечаны прамысловасці. Ужо разглядаўся варыянт будаўніцтва гадзіннікавага завода, вытворчасць лічылася не шкоднай, таму будаваць яго збіраліся недалёка ад парка культуры і адпачынку ў раёне Старажоўкі, хоць у выніку ён аказаўся каля іншага парка.



Клуб металістаў Мінска.

Метал і гума на тэрыторыі БССР не выраблялiся, таму аб узвядзенні гігантаў не было гаворкі. Мінск павінен быў стаць цэнтрам мясцовай вытворчасці. У аснове — абутковая, тэкстыльная і харчовая прамысловасць. Меркавалася, што ў 1955 годзе колькасць жыхароў дасягне 500 тысяч, сетка вуліц пойдзе на поўнач у бок Лагойскага тракта, дзе больш чыстыя землі.

— Многія не прымаюць гэтую рэдакцыю плана, бо ён «пахаваў» гістарычны цэнтр горада. Але трэба разумець, што гэта было зроблена не толькі з-за таго, што ленінградская група крытыкавала Мінск за местачковасць, але таму што Стары горад пастаянна затапляўся і будынкі знаходзіліся ў жахлівым санітарным стане. Магчымасці пракласці каналізацыю і водаправод без пашкоджання будынкаў не было. На гэтым месцы хацелі ўладкаваць вялізную зялёную паркавую зону. Паркавая магістраль павінна была ісці на поўнач праз Татарскія агароды ў раён цяперашняга Камсамольскага возера, якога тады не было і ў задумцы. А вось цэнтральныя вуліцы мусілі застацца вузкімі: шкадавалі каштоўную мураваную і цагляную забудову. Каб вырашыць пытанні з транспартам, планавалі зрабіць дзве кальцавыя дарогі, амаль там, дзе яны размяшчаюцца і зараз, — расказаў Павел Растоўцаў.

У 1938 годзе пачалі гаварыць аб магчымым пераносе сталіцы ў Магілёў, таму была прынятая больш «сціплая» рэдакцыя плана, разлічаная на значна меншы прырост насельніцтва. На паўднёвым усходзе горада планаваўся прамысловы кластар, параіўшыся з чыгуначнікамі, усё ж вырашылі будаваць абводную ветку чыгункі. Да 1940 года сітуацыя зноў памянялася. У новым плане ўжо ўзнікла парадная забудова цяперашняга праспекта Незалежнасці, галоўная набярэжная вяла да Круглай плошчы, якой, дарэчы, збіраліся даць імя Маякоўскага. А вуліца Захарава павінна была стаць вуліцай Маякоўскага, там жа ўзводзілі капітальныя будынкі з каланадамі, якія не захаваліся, і пракладалі трамвайную магістраль у раён цяперашняга трактарнага завода. Пасля вайны менавіта апошні праект і лёг у аснову генплана горада.

### «Перамога» ў спадчыну ад харчавікоў

— Што датычыцца стылістыкі, то з пачатку 1920-х у Савецкім Саюзе панаваў канструктывізм, на змену якому больш як праз дзесяцігоддзе прыйшоў неакласіцызм, — адзначыў **гісторык Уладзімір САДОЎСКІ.**

Актыўна ў 20-я гады вялося клубнае будаўніцтва. Фарміраваўся новы быт, лічылася, што пасля завода пралетарый пойдзе ў клуб, ці кажучы на манер таго часу — клюб. Адзін з прыкладаў — Мінскі клуб металістаў. Прызначаўся для супрацоўнікаў металаапрацоўчых прадпрыемстваў горада і размяшчаўся на Універсітэцкай вуліцы, цяперашняй Кірава. Раней яна так называлася, таму што на ёй знаходзіліся некаторыя карпусы БДУ і некалькі іншых універсітэтаў, напрыклад, імя Леніна. Будынак клуба тыповы: дакладна такі ж быў узведзены ў Віцебску на беразе Дзвіны, прычым для тых жа самых мэт. У адрозненне ад мінскага ён захаваўся.

Яшчэ адзін прыклад такой архітэктуры — Клуб харчавікоў, які потым быў перайменаваны ў гонар Сталіна. Гэта не зусім страчаны будынак, на яго месцы з выкарыстаннем часткі канструкцыі быў пабудаваны кінатэатр «Перамога». Корпус, дзе месціцца зала для гледачоў, захаваўся, а галоўны фасад цалкам змяніўся. Будынак лічыўся прагрэсіўным, бо ў ім мелася некалькі вялікіх залаў, у якіх можна было мяняць планіроўку. Меркавалася, што дахі таксама могуць стаць пляцоўкамі для адпачынку, але насамрэч так яны ніколі не выкарыстоўваліся, таму потым былі заменены на паўнавартасныя паверхі. Менавіта тут упершыню ў Мінску адбываўся міжнародны чэмпіянат па грэка-рымскай барацьбе. Будынак пацярпеў ад бамбардзіровак у канцы вайны, потым быў адноўлены ўжо ў выглядзе кінатэатра.



Першая мінская АТС.

Адным з першых прадпрыемстваў сучаснага Мінска была малочная фабрыка або, як яе тады называлі, Цэнтральная малочня на вуліцы Маскоўскай. У 30-я гады ёй прысвячалі шмат артыкулаў, бо тут выраблялі 11 тысяч тон малочных прадуктаў у суткі, больш не маглі — не хапала сыравіны. На фабрыцы ўпершыню была арганізавана механізаваная мойка бутэлек, да гэтага малако прадавалася з металічных бідонаў, што садзейнічала распаўсюджванню захворванняў. У 1970-я гады малочны завод быў рэканструяваны і стары будынак знесены. Памяць аб ім захавалася ў назве суседняга завулка — Малочны.

У Шэрагу галоўных будоўляў міжваеннага Мінска быў універсітэцкі гарадок. Планы былі ўнушальныя, пышныя пректы прапаноўвалі на ўсесаюзным архітэктурным конкурсе. У 1920-я гады было пабудавана сем карпусоў, з іх да нас дайшло часткова чатыры: напрыклад, геафак і стары педфак, які знаходзіцца ва ўнутраным дворыку сучаснага Педагагічнага ўніверсітэта. А вось на месцы старога хімфака зараз пустая пляцоўка, хоць ён і быў знесены дзясяткі гадоў таму дзеля новага будаўніцтва.

У той перыяд Мінск ганарыўся сваёй аўтаматычнай тэлефоннай станцый, даволі сучаснай, нават на ўсесаюзным узроўні, якая была пабудавана на вуліцы Карла Маркса. Станцыя магла абслугоўваць да пяці тысяч абанентаў. А з эстэтычнага пункту гледжання вылучалася кантора Дзяржбанка СССР, пабудаваная з рысамі канструктывізму і рацыяналізму, які панаваў у заходнім свеце.

Што да жылых дамоў, то іх часта будавалі жыллёвыя таварыствы. Радавалі вочы мінчан дом «Асветнік-камунар» на Свярдлоўскай вуліцы, дзе жылі пісьменнікі і навукоўцы, у тым ліку і Кузьма Чорны, і дом спецыялістаў у раёне вуліцы Казлова, спраектаваны Наталляй Макляцовай. Ён быў адным з самых высокіх будынкаў у горадзе — 6 паверхаў, таму ў ім нават працаваў ліфт. Абодва дамы ў гады вайны былі разбомбленыя, аднак дом спецыялістаў потым пабудавалі нанова.



Клуб харчавікоў, у будучым — кінатэатр «Перамога».

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# «Да сваіх беларусаў і ў вёсцы зайду...»

**Яшчэ летась «звяздоўская» пошта прынесла вось гэты верш... Спярша — у падрадковым перакладзе з удмурцкай на рускую мову. Газета звярнулася да лаўрэата дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколы Мятліцкага з просьбай перакласці твор на нашу родную мову.**



Да Мікалая Міхайлавіча звярнуліся не выпадкова. Ён і раней перакладаў Вячаслава Ар-Сяргі, які ў 2008 годзе прыязджаў у Беларусь на традыцыйны міжнародны круглы стол айчынных і замежных пісьменнікаў «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», прымаў удзел у святкаванні Дня беларускага пісьменства. Вершы Вячаслава Ар-Сяргі друкаваліся ў «Полымі». А па-руску — у часопісе «Всемирная литература». Тады ж, у 2008 годзе, Вячаслаў Васілевіч пазнаёміўся са многімі беларускімі літаратарамі, шмат з кім пасябраваў... Зараз, калі часам піша па электронцы, згадвае светлай памяці паэта Юрыя Міхайлавіча Сапажкова. Нейкае душэўнае, сардэчнае яднанне атрымалася ў Вячаслава з беларускім паэтам Віктарам Гардзеем. Яны, як памятаю, не толькі пра Беларусь і літаратуру гутарылі, але і пра Віктару Гардзею знаёмую Каму. Так спакваля ў Віктара Канстанцінавіча шлях скіраваўся да перакладу кнігі вершаў удмурцкага паэта, і летась Выдавецкі дом «Звязда» кнігай Вячаслава Ар-Сяргі «Ранішні вецер у акне» адкрыў серыю «Сябрына: паэзія народаў Расіі».

У тую амаль дзесяцігадовай даўнасці паездку па Міншчыне наш удмурцкі сябра пабываў у вёсках Мётча Барысаўскага, Блужа, Блонь, Зацітава Слабада, горадзе Мар'іна Горка Пухавіцкага, гарадскім пасёлку Смілавічы Чэрвеньскага раёнаў, у самім Чэрвені. З вялікай цікавасцю ў Блужы ў школьным музеі распытваў пра Героя Савецкага Саюза воіна-«афганца» Мікалая Чэпіка. Была ў гэтых роспытах асаблівая нагода... У сярэдзіне 1980-х Вячаслаў служыў у войску ў Туркестанскай акрузе, дакладней — у Ашхабадзе, з многімі беларусамі поруч. А дывізія, куды камсамольцаў Іжэўска і іншых удмурцкіх ваколіц накіроўвалі, была адмысловая — у ёй рыхтавалі папаўненне для савецкага кантынгента ў Афганістане...

З тае паездкі па Міншчыне нарадзілася некалькі беларускіх вершаў Ар-Сяргі — «У Камісарскім Садзе», «Зацітава Слабада»... Сёння яны вядомыя і беларускаму чытачу. Як і вось гэты праніклівы, шчыры твор, з якім зараз знаёмяцца чытачы «Звязды».

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

**Вячаслаў АР-СЯРГІ, народны пісьменнік Удмурціі**

## ВЕТРЫК — У БЕЛАРУСЬ

*На Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь*

Беларусь,
блаславёная Богам зямля,
Да цябе ветрам цёплым
лячу я здаля —
Да тваіх, Беларусь, гарадоў
Цеплынёю душы
я прыпасці гатоў...

Я праводжу сяброў у застолле,
Беларускую песню спяю...
Падару вам паклоны Прыкам'я,
А на памяць — і песню сваю!

Да сваіх беларусаў
і ў вёсцы зайду,
Там на танец
дзяўчыну-красу запрашу,
Да багатых сталоў
у гасціны прыйду —
Ціха-мірна ў куце пасяджу...

Беларускаю радасцю поўны, —
Прагучала як голас святынь...
Дзень для добрага ветру —
цудоўны,
Слёзы — у дождж, і — цяплынь...

*3 ліпеня 2016 года*

**З удмурцкай.**
**Пераклаў Мікола МЯТЛІЦКІ.**